# Гмах, які глядзіць у будучыню

*Мы так шмат пісалі пра небывалы дасюль Храм Кнігі — новую Нацыянальную бібліятэку Беларусі, што, здаецца, ужо дакладна ведаем, як павінны выглядаць яе залы, калідоры, кнігасховішчы. Але гэта толькі здаецца. Бо будаўніцтва бібліятэкі — жывы, творчы працэс, падчас якога нараджаюцца і ажыццяўляюцца новыя і новыя ідэі. Так, згодна з Пратаколам даручэнняў Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі ад 17 мая 2005 года распачата стварэнне на базе Нацыянальнай бібліятэкі Рэспубліканскага інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра. Гэта і стала галоўнай тэмай нашага інтэрв'ю з дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Раманам МАТУЛЬСКІМ.*

**— Раман Сцяпанавіч, скажыце, калі ласка, чым узбагаціцца Нацыянальная бібліятэка ў выніку стварэння Рэспубліканскага інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра? Як рэалізацыя гэтай ідэі паўплывае на яе функцыі?**


Фота Юрыя ІВАНОВА

— Адзначу, што паралельна з будаўніцтвам адбываецца асэнсаванне ролі будучай Нацыянальнай бібліятэкі ў жыцці нашага грамадства, Прэзідэнтам краіны дадзены даручэнні па стварэнні ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі Прэзідэнт-цэнтра, міжнароднага прэс-цэнтра, залы для правядзення сустрэч і перагавораў на вышэйшым узроўні, шматфункцыянальнай канферэнц-залы на 550 месцаў.

Канцэпцыя стварэння на базе будынка Нацыянальнай бібліятэкі Рэспубліканскага інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра зацверджана пастановай Савета Міністраў ад 26 мая 2005 года. Асноўная ідэя Канцэпцыі — так званы "інтэлектуальны будынак", у якім усе сістэмы будуць аб'яднаны ў адзіны комплекс і кіравацца з адзінага цэнтра. Другая ідэя канцэпцыі — каб будынак бібліятэкі, насычаны "разумнымі" сістэмамі, служыў базай для развіцця сучасных тэхналогій фарміравання інфармацыйных рэсурсаў. Аўтаматызацыя, падкрэслю, — не самамэта, але сродак забяспечыць аператыўны доступ наведвальніка да неабходнай яму інфармацыі, незалежна ад таго, мае цца яна ў нашай бібліятэцы або на іншым кантыненце, прыйшоў чытач непасрэдна ў бібліятэку ці ён вясковы настаўнік недзе на Палессі, які даў запыт праз камп'ютэрную сувязь.

**— Якім чынам мяркуецца гэтага дасягнуць?**

— Нацыянальная бібліятэка будзе ў першую чаргу збіраць і назапашваць неабходныя інфармацыйныя рэсурсы, ствараць іх пошукавыя вобразы, выконваць функцыі навігатара і каардынацыйнага цэнтра ў сусветнай інфармацыйнай прасторы. Мы набываем і будзем набываць электронныя базы дадзеных самага рознага кшталту. Так, на працягу чацвёртага квартала 2005 года і першага квартала 2006 года запланавана закупка каля 15 баз дадзеных, найбольш патрэбных, паводле праведзенага даследавання і апытання, нашым чытачам. Сёлета мы практычна стварылі віртуальны чытальны зал дысертацый Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі, які карыстаецца велізарным попытам сярод наведвальнікаў.

**— Аднак функцыі Рэспубліканскага інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра — гэта далёка не толькі аптымальнае задавальненне попыту на тыя ці іншыя веды?**

— Сацыякультурны цэнтр будзе складацца з многіх элементаў, у прыватнасці, у ім з'явіцца карцінная галерэя, музей кнігі і бібліятэкі. Ідуць перамовы аб закупцы для музея спецыяльных выставачных вітрын, каб размясціць у іх рарытэтныя старадрукі, якія дасюль былі схаваны ад вачэй публікі. Будзе сістэма чытальных залаў, прысвечаных літаратуры і мастацтву, дзе творчыя дзеячы знойдуць усё для плённай працы, а проста аматары прыгожага — для прыемнага баўлення часу. Асобныя элементы сацыякультурнага цэнтра будуць дзейнічаць па прынцыпе самаакупляльнасці. Гэта аглядная пляцоўка на даху бібліятэкі, з якой на вышыні 72 метраў можна будзе любавацца панарамай Мінска і яго наваколлямі, а таксама фізкультурна-аздараўленчы комплекс, салон прыгажосці, рэстаран, кафэ. Але тут я хачу звярнуць вашу ўвагу на тое, што гэтая інфраструктура зойме сотыя долі аб'ёму будынка. У бібліятэку штодня прыйдуць працаваць некалькі тысяч наведвальнікаў плюс тысяча чалавек абслугоўваючага персаналу, і трэба прадаставіць ім хуткае, смачнае, даступнае па цэнах харчаванне ў камфортных умовах. А па вечарах кафэ будзе адкрыта "на вуліцу", прымаць турыстаў, праводзіць забаўляльныя праграмы.

— Думаецца, **у сацыякультурным цэнтры бібліятэкі да месца прыйшоўся б і клуб творчай інтэлігенцыі...**

— У праекце прадугледжана літаратурна-мастацкая гасцёўня. У ёй з радасцю сустрэнуць усіх неабыякавых да мастацтва ў розных яго праявах. Чакаем канкрэтных заявак і прапаноў ад творчых саюзаў, клубаў. Увогуле я не магу назваць ніводнага творчага чалавека з тых, з кім я меў размову, хто б не выказаў зацікаўленасці і жадання далучыцца да культурнага жыцця Нацыянальнай бібліятэкі, да развіцця закладзеных у яе праекце ідэй. Але спачатку яны жадаюць убачыць ў сцэны новай бібліятэкі, адчуць яе атмасферу, убачыць яе магчымасці.

**— Як у новым будынку будзе арганізавана прапускная сістэма?**

— Бібліятэка будзе мець галоўны ўваход, звернуты да праспекта Незалежнасці. Усе наведвальнікі пройдуць перарэгістрацыю і атрымаюць новы пластыкавы білет з электронным чыпам. Сістэма кантролю доступу пры галоўным уваходзе не дазволіць ні пранікнуць у бібліятэку без білета, ні пранесці ўнутр небяспечныя рэчывы, ні вынесці самахоць кнігі. Але ў бібліятэчнай справе ёсць рацыянальнае правіла: "каб не перасякаліся патокі". Таму ў асобныя зоны сацыякультурнага цэнтра будуць свае ўваходы, напрыклад, на агладную пляцоўку, у кафэ, у салон прыгажосці.

**— Ці не сутыкнецца з цяжкасцямі бібліятэчны персанал, запускаючы ў дзеянне будынак, начынены суперсучаснымі тэхналагічнымі сістэмамі?**

— Гмах Нацыянальнай бібліятэкі, што вырас у нас на вачах, — унікальны, аналагаў яму няма на ўсёй постсавецкай прасторы. Але мы маем кадры для працы ў новых умовах. У мінулым годзе Міністэрства культуры распрацавала і зацвердзіла праграму, у адпаведнасці з якой мы, па-першае, накіравалі сваіх работнікаў на вучобу і павышэнне кваліфікацыі ў Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў і ў Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры, а па-другое, прынялі на працу больш за 80 маладых спецыялістаў, узброеных перадавымі ведамі.

У "інтэлектуальным будынку" Нацыянальнай бібліятэкі, кіруемым як адзіны механізм, можна ўбачыць праваобраз архітэктуры будучыні.

**Гутарыла Святлана ІШЧАНКА**